**І.М.Стрыжонак,** *ст.выкладчык*

# ФАРМІРАВАННЕ ПРАФЕСІЙНАЙ НАКІРАВАНАСЦІ БУДУЧЫХ БІБЛІЯТЭКАРАЎ У ПРАЦЭСЕ ВЫКЛАДАННЯ КУРСА "БІБЛІЯТЭКАЗНАЎСТВА. ТЭОРЫЯ"

Тэарэтычныя праблемы даследавання прафесійнай накіраванасці асобы як вядучага сістэмаўтваральнага фактару прафесійнай падрыхтоўкі спецыяліста з'яўляюцца часткай тэорыі накіраванасці і грунтоўна аналізуюцца ў працах псіхолагаў і педагогаў. Псіхалагічная катэгорыя накіраванасці, уведзеная ў навуковы ўжытак знакамітым вучоным С.Л.Рубінштэйнам пры распрацоўцы тэорыі дзейнасці, атрымала інтэнсіўнае развіццё ў 60–80-я гг. XX ст. у працах шматлікіх прадстаўнікоў савецкай псіхалагічнай і педагагічнай навукі. Буйнейшыя вучоныя Б.Г.Ананьеў, Л.І.Бажовіч, А.А.Бадалёў, Б.І.Дадонаў і іншыя ўсебакова даследавалі сутнасць і змест накіраванасці, яе асноўныя кампаненты, віды, тыпалогію; суадносіны матываў, мэт і стымулаў. Накіраванасць разглядаецца псіхолагамі як "дамінуючая тэндэнцыя" (С.Л.Рубінштэйн), як вядучая характарыстыка асобы (М.У.Гамеза), як адзін з істотных кампанентаў псіхалагічнай структуры (К.К.Платонаў).

Я.Д.Грыгаровіч у рабоце "Эстэтычная накіраванасць асобы студэнта: педагагічны аспект" (2002) вызначае накіраванасць як псіхалагічную ўласцівасць асобы, як вядучую, найбольш істотную характарыстыку, якая вызначае дзейнасць асобы і праяўляецца ў гэтай дзейнасці. У аснове накіраванасці, падкрэслівае аўтар, ляжыць іерархічная сістэма сэнсаўтваральных матываў, у якіх дамінуючыя матывы, падпарадкоўваючы сабе астатнія, вызначаюць будову матывацыйнай сферы чалавека. Пад матывамі разумеюцца пабуджэнні да дзейнасці, звязаныя з задавальненнем патрэбнасцей чалавека, сукупнасць вонкавых і ўнутраных умоў, якія выклікаюць актыўнасць асобы і вызначаюць яе мэтанакіраваны характар. Накіраванасць асобы як устойлівая

сістэма матываў найбольш поўна выяўляецца ў дзейнасці, яе змесце, інтэнсіўнасці і спосабах рэалізацыі. Таму ў аснову класіфікацыі накіраванасці, лічыць Я.Д.Грыгаровіч, мэтазгодна пакласці саму дзейнасць асобы. Пры такім падыходзе накіраванасць дастаткова арганічна падзяляецца на пазнавальную, прафесійную, педагагічную, эстэтычную і інш. Прафесійная накіраванасць як важнейшая падструктура асобы студэнта носіць мнагамерны характар: з функцыянальнага пункту гледжання яна ўключае намеры, матывацыйную сферу, інтарэсы і схільнасці студэнтаў. Акрамя структурнай характарыстыкі, прафесійная накіраванасць мае якасны бок.

Па вызначэнні К.К.Платонава, яна можа адлюстроўваць узровень, шырыню, устойлівасць, інтэнсіўнасць і дзейснасць. Акрамя таго, прафесійная накіраванасць праяўляецца і ва ўстаноўках, захапленнях, пераканаинях, ідэалах і патрэбнасцях.

Да паступлення ва універсітэт у жадаючых у ім вучыцца прафесійныя намеры праяўляюцца ў выглядзе мары, захаплення і абстрактнага ўяўлення аб бібліятэчнай дзейнасці. Не сакрэт, што вядучымі матывамі выбару прафесіі бібліятэкара-бібліёграфа звычайна бываюць прыклады і парады родных, сяброў, настаўнікаў. Большасць абітурыентаў паступаюць на факультэт інфармацыйна-дакументных камунікацый без уліку асабістых магчымасцей і спецыфікі будучай прафесіі, зыходзячы з жадання атрымаць вышэйшую адукацыю. Такім чынам, інтарэсы і схільнасці знаходзяцца ў пачатковым стане, а матывы недастаткова аргументаваны.

У перыяд навучання ва універсітэце намеры набываюць устойлівую мэтанакіраванасць. Інтарэсы і схільнасці перарастаюць у дзейнасць па засваенні прафесійных ведаў, уменняў і навыкаў, а матывы пераўтвараюцца ва ўнутраныя стымулюючыя сілы і становяцца патрэбнасцю. Для станаўлення студэнта як спецыяліста неабходны адпаведныя перадумовы, адным з індыкатарам якіх з'яўляецца прафесійная накіраванасць. Звычайна пад прафесійнай накіраванасцю разумеюць станоўчыя



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

адносіны, інтарэс да прафесіі, схільнасць ёю займацца. Поспех асваення прафесіі бібліятэкара залежыць ад таго, наколькі ў студэнта сфарміраваны інтарэс да будучай прафесіі, наколькі развіта патрэбнасць у набыцці прафесійных ведаў. Галоўным каналам суадноснага ўздзеяння на асобу студэнта ва універсітэце з'яўляецца вучэбны працэс з той вучэбнай інфармацыяй, на падставе якой і фарміруюцца веды будучага спецыяліста.

Выкладаемая ў III семестры вучэбная дысцыпліна "Бібліятэказнаўства. Тэорыя", якая забяспечвае метадалагічную і агульнатэарэтычную падрыхтоўку спецыялістаў у галіне інфармацыйна-бібліятэчнай дзейнасці, садзейнічае фарміраванню прафесійнай накіраванасці будучых бібліятэкараў. Структура, праблематыка, змест курса "Бібліятэказнаўства. Тэорыя" садзейнічаюць асэнсаванню студэнтамі дзейнасці бібліятэкі як сацыяльнага інстытута, як важнага элемента грамадства, які арганічна інтэграваны ў яго сацыяльна-палітычную, ідэалагічную і каштоўнасную структуру. У лекцыях і на семінарскіх занятках па першаму раздзелу курса "Асновы вучэння аб бібліятэцы" ўвага звяртаецца на раскрыццё прычын узнікнення і існавання бібліятэкі, на прынцыпы і функцыі дзейнасці бібліятэк, іх структуру, класіфікацыю і тыпалагізацыю, а таксама на асаблівасці ўзаемадзеяння са знешнім асяроддзем.

Пры выкладанні матэрыялу другога раздзела "Бібліятэчная справа як галіна дзейнасці" адбываецца знаёмства студэнтаў з агульнай характарыстыкай бібліятэчнай справы, яе сутнасна-функцыянальнай структурай, сучасным станам і перспектывамі развіцця; асаблівая ўвага надаецца аналізу структуры і асаблівасцям функцыянавання сетак бібліятэк Беларусі. Усё гэта выклікае цікавасць, станоўчыя адносіны ў студэнтаў да дзейнасці бібліятэк, якія яны раней успрымалі толькі як чытачы.

Фарміраванне прафесійнай накіраванасці, замацаванне інтарэсу да прафесіі працягваюцца і пры арганізацыі самастойнай працы студэнтаў па курсу, якая адбываецца ў двух кірунках:

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– самастойная работа студэнтаў на аўдыторных занятках пад кіраўніцтвам выкладчыка;

– дзейнасць студэнта, ажыццяўляемая ў адпаведнасці з вучэбным планам самастойна (у пазаўрочны час).

Пачынаючы з першых лекцый, выкладчыкі садзейнічаюць фарміраванню ўстановак і ўнутранай матывацыі да набыцця прафесійных ведаў, якія потым замацоўваюцца ў ходзе семінарскіх заняткаў. Выкарыстоўваючы розныя спосабы праблемна-пошукавага тыпу навучання, якое развівае творчае мысленне студэнтаў, выкладчыкі актывізуюць развіццё інтарэсу да прадмета.

Самастойнае вывучэнне студэнтамі асноўнай і дадатковай літаратуры па курсу, канспектаванне першакрыніц, апрацоўка лекцыйных запісаў падтрымліваюць іх цікавасць да вывучаемай дысцыпліны, замацоўваюць матывацыйную сферу. Але асабліва эфектыўна спрыяе прафесійнай накіраванасці будучых спецыялістаў, выклікае іх інтарэс да прафесіі і жаданне ёю займацца вучэбна-азнаямляльная практыка, якая ўводзіць студэнтаў у прафесію шляхам знаёмства з асаблівасцямі і асноўнымі кірункамі дзейнасці бібліятэк розных тыпаў і відаў.

Аб уплыве вучэбнай практыкі на развіццё інтарэсу студэнтаў да сваёй будучай прафесіі сведчаць вынікі праведзенага намі ў снежні 2002 г. анкетавання студэнтаў II курса ФБІС. Усяго было апытана 72% студэнтаў II курса. З 50% ад агульнай сукупнасці рэспандэнтаў, якія напісалі, што іх не цікавіць прафесія бібліятэкара і паступілі яны ва універсітэт, каб атрымаць дыплом аб вышэйшай адукацыі, 35% пасля праведзеных экскурсій у бібліятэкі адзначылі ўзніклую цікавасць да прафесіі бібліятэкара і яе прывабнасць. Амаль 85% рэспандэнтаў адзначылі, што правядзенне экскурсій у бібліятэкі станоўча ўздзейнічае на фарміраванне ў іх інтарэсу да будучай прафесіі.

Такім чынам, засваенне матэрыялу курса “Бібліятэказнаўства. Тэорыя” спрыяе таму, што намеры атрымаць прафесію бібліятэкара паступова пераходзяць ва ўстойлівую цікавасць, а



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

схільнасць як сістэматычная дзейнасць, накіраваная на іх рэалізацыю, становіцца ўнутранай заахвочваемай сілай, якая спрыяе засваенню спецыяльных дысцыплін. Выкладанне курса “Бібліятэказнаўства. Тэорыя”, як і іншых спецыяльных тэарэтычных і гістарычных дысцыплін на кафедры тэорыі і гісторыі інфармацыйна-дакументных камунікацый, закладвае метадалагічную аснову дзейнасці будучага спецыяліста. Студэнт атрымлівае фундаментальную тэарэтычную падрыхтоўку, пры гэтым ён авалодвае асаблівасцямі разумовай і вучэбнай працы, знаёміцца з алгарытмамі прафесійнай дзейнасці спецыяліста, што спрыяе фарміраванню ўстаноўкі на актыўнае авалоданне прафесіяй.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ